## РАЎБІЧЫ ПРЫМАЮЦЬ ЭТАП КУБКА СВЕТУ ПА ФРЫСТАЙЛЕ

### У выхадныя тут выступяць усе наймацнейшыя лыжныя акрабаты свету

**З 22 па 25 лютага Беларусь прымае этап Кубка свету па фрыстайле. У ім удзельнічае 46 лыжных акрабатаў з усяго свету. Такое права нашай краіне прадастаўлена другі год запар — летась у Раўбічах прайшоў фінальны этап. Арганізатары і госці запэўніваюць, што сёлета турнір арганізаваны значна лепш, чым летась, і, нягледзячы на капрызы надвор'я, пройдзе на самым высокім узроўні.**

Як паведаміў **намеснік міністра спорту і турызму Сяргей НЕРАД**, дзякуючы таму, што леташні турнір у нашай краіне быў высока ацэнены Міжнароднай федэрацыяй лыжнага спорту, сёлета Беларусі зноў даверылі правядзенне этапу. Спачатку хваляванні арганізатараў выклікала цёплае і бясснежнае надвор'е, але потым выпаў снег. Зараз зноў надвор'е не спрыяе зімовым відам спорту, але галоўны суддзя спаборніцтваў Віктар Грошаў запэўніў, што сёлета траса падрыхтавана значна лепш і спаборніцтвы адменены не будуць, нягледзячы нават на дождж.

Галоўны трэнер нашай каманды Мікалай Казека расказаў пра падрыхтоўку нашай каманды, якая даўно ўвайшла ў эліту сусветнага фрыстайлу:

— Леташнія спаборніцтвы мелі шырокі рэзананс у міжнародных колах фрыстайла. Усе спартсмены выказваліся, што гэта быў адзін з лепшых этапаў. Сёлета мы лепш падрыхтавалі трасу, маем вялікі запас снегу. Упершыню ў сезоне змаглі прадаставіць 3 трэніровачныя дні спартсменам. Усе прэтэндэнты на перамогу ў Кубку свету прыбылі ў Мінск.

Мікалай Казека паведаміў, што ў спаборніцтвах возьме ўдзел Дзмітрый Дашчынскі, праўда, ён гатовы на 50%. Летась Дзмітрый перанёс аперацыю і прапусціў перадсезонную падрыхтоўку. Верагоднасць таго, што ў Раўбічах выступіць Антон Кушнір — 75%. Фрыстайліст атрымаў траўму на перадсезоннай падрыхтоўцы і пакуль сумяшчае выступленні з аднаўленнем. Яшчэ адзін наш вядомы фрыстайліст, алімпійскі чэмпіён Аляксей Грышын, аднаўляецца пасля траўмы спіны і ў сакавіку прыступіць да трэніровак. Каманду прадставіць сярэбраны прызёр аднаго з этапаў Максім Гусцік.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# Каму банк дае ЛЬГОТНЫЯ КРЭДЫТЫ?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

☎ ***— Маю дваіх дзетак, якіх выхоўваю адна, бо ў разводзе. Наш аддзел адукацыі арганізоўвае кааператыў у пасёлку Старобін. Працую я ў Салігорску, а прапісана ў сельскай мясцовасці ў бацькоў. На які льготны крэдыт я магу разлічваць?***

**Нікановіч Ганна,**
*г. Салігорск.*

— Згодна з вашай інфармацыяй атрымліваецца, што вы маеце права атрымаць ільготны крэдыт, бо збіраецеся будавацца ў населеным пункце з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек. Удакладніць гэтае права на ўключэнне ў спісы на льготны крэдыт вам неабходна ў выканкаме па месцы пастаноўкі на жыллёвы ўлік.

***— Якія ўмовы цяпер па такім крэдыце?***

— Такі крэдыт выдаецца ў памеры 20 працэнтаў стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка, якая дзейнічае на дату ўключэння вас у спісы на атрыманне льготнага крэдыту, але не менш чым 5% гадавых. Крэдытуецца 20 квадратных метраў на чалавека. Максімальны памер ільготнага крэдыту складае 90% кошту будаўніцтва вызначаных нормаў памераў агульнай плошчы жылля тыпавых спажывецкіх якасцяў. Ёсць яшчэ такая катэгорыя, як маладая сям'я, якая выхоўвае дваіх непаўналетніх дзяцей на дату ўключэння ў спісы на льготны крэдыт. У гэтым выпадку крэдыт выдаецца пад 50% ад стаўкі рэфінансавання на дату ўключэння ў спісы на льготны крэдыт.

☎ ***— Мы — маладая сям'я з трох чалавек. Стаім у жыллёвай чарзе з 2007 года. Ці дадуць нам ільготны крэдыт як маладой сям'і?***

**Жукоўская Яўгенія,**
*г. Беразіно.*

— У першую чаргу вам трэба звярнуцца ў мясцовы выканкам, каб удакладніць, ці маеце вы права на ўключэнне ў спісы на льготны крэдыт. Беларусбанк такія спісы не фарміруе, а толькі выдае крэдыты. Разам з тым, згодна з Указам № 13, ільготны крэдыт даецца маладым сем'ям, якія маюць і выхоўваюць дваіх непаўналетніх дзяцей. У вас толькі адно малое. Аднак... Ільготны крэдыт магчыма атрымаць і па іншай катэгорыі, калі вы пачняце паляпшаць жыллёвыя ўмовы ў населеным пункце колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек. Вы даглядаеце дзіця, а муж ваш працуе ў Беразіно?

***— Не, ён увогуле не працуе.***

— Трэба, каб працаваў, тады з'явіцца магчымасць атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва жылля пад 10% ад стаўкі рэфінансавання.

☎ ***— Атрымаць ільготны крэдыт могуць толькі тыя сем'і, якія лічацца незаможнымі. Колькі трэба тады атрымліваць у месяц даходу на кожнага члена сям'і? І яшчэ, я 9 гадоў жыла па дагаворы найму ў прыватным сектары. Зараз жыву ў сваякоў. Калі я зноў буду здымаць жыллё, то будуць гэтыя тэрміны падсумоўвацца?***

**Волкава Алена,**
*г. Віцебск.*

— Што тычыцца маламаёмных сем'яў, то гэта сем'і, у якіх сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышае трохразовага сярэднямесячнага мінімальнага спажывецкага бюджэту (СМСБ) сям'і з 4 чалавек, які бярэцца за 12 месяцаў да месяца падачы дакументаў для ўключэння ў спісы на атрыманне льготнага крэдыту (з 1 лютага 2012 года гэты СМСБ вызначаны ў памеры 1млн 101 тыс. 440 руб.) ці 3 млн 304 тыс. 320 руб., і сем'і, якія маюць заяўленую маёмасць, агульны кошт якога не перавышае двухразовага гранічнага памеру льготнага крэдыту для гэтай сям'і. Так, Указ № 13 прадугледжвае пазачарговае права на атрыманне льготных крэдытаў тым бескватэрным жыхарам, якія пражылі больш за 10 гадоў у інтэрнаце або здымалі жыллё па дагаворах найму ў прыватным сектары ці па дагаворах паднайму ў памяшканнях дзяржаўнага фонду. Аб тым, ці падсумоўваюцца тэрміны пражывання па дагаворах, вам трэба ўдакладніць у мясцовым выканкаме, які прымае рашэнне аб уключэнні ў спісы на льготны крэдыт.

***— Ці дадуць ільготны крэдыт маці, якая даглядае дзіця ў дэкрэтным водпуску?***

— Такія пытанні банкам разглядаюцца. У гэтым выпадку ў ваш сукупны даход уключаецца даход аднаго з паручыцеляў (блізкага сваяка — напрыклад, вашага мужа).

***— Увогуле, якія льготныя крэдыты сёння даюцца?***

— Самымі прывабнымі з'яўляюцца крэдыты для шматдзетных сем'яў, якія даюцца пад 1% гадавых на 40 гадоў. Для шматдзетных нават у Мінску крэдытуецца 20 кв. метраў на чалавека. Крэдыт для тых, хто жыве і працуе ў населеных пунктах з колькасцю жыхароў да 20 тысяч чалавек, даецца пад 10% ад стаўкі рэфінансавання, але не менш як 3% гадавых. Прадугледжаны крэдыт для маладых сем'яў, якія маюць і выхоўваюць дваіх непаўналетніх дзяцей. Такі льготны крэдыт даецца пад 50% ад стаўкі рэфінансавання, але не менш чым пад 5% гадавых. Астатнім катэгорыям вызначаных урадам ільготнікаў даецца крэдыт пад 20% стаўкі рэфінансавання.

**Сяргей КУРКАЧ.**
***(Заканчэнне будзе.)***

**Факт**

### ПРЫГАЖУНЮ ВЫРАТАВАЎ ВАДАЛАЗ

**Падчас правядзення VIII Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь-2012» адна з удзельніц упала ў басейн. Работнік МНС выратаваў дзяўчыну.**

— Здарэнне адбылося ў басейне гарадскога цэнтра алімпійскага рэзерву па сталічнай вуліцы Герояў 120-й дывізіі, — распавёў падрабязнасці здарэння **старшы інспектар Цэнтра даследаванняў ў галіне бяспекі жыццядзейнасці МНС Алег Малевіч.** — З памоста ў ваду звалілася ўдзельніца конкурсу, ураджэнка Гродна Кацярына Слышова. Дзяўчына не ўмела плаваць, а глыбіня басейна ў месцы яе падзення складала каля 7 метраў. Вадалазны спецыяліст цэнтра вадалазна-выратавальнай службы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Сяргей Пастаялкін выратаваў прыгажуню.

### КРАІНА НЕ СТРАЦІЛА НІВОДНАГА ЖЫЦЦЯ

**Упершыню з пачатку года ў сутачнай зводцы насупраць радка «Загінула людзей» у аператыўнай зводцы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях з'явілася лічба «0».**

— У перыяд з 22 па 23 лютага ў краіне адбылося 14 пажараў, на якіх ніхто не загінуў. Такое сёлета здарылася ўпершыню, — сказаў «Звяздзе» старшы інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці МНС Алег Малевіч. — Пажарныя выратавалі трох чалавек.

### САБАКУ З ПАЛОНКІ ЗНОЙДУЦЬ ГАСПАДАРА

**Пра тое, што ў сталіцы на Свіслачы ў раёне вуліцы Лугавой тоне сабака, паведаміў выпадковы відавочца.**

— Гэта здарылася каля 16 гадзін. Калі да месца выкліку прыбылі работнікі МНС, яны ўбачылі, што сабака знаходзіцца прыкладна за 15 метраў ад берага: самастойна спрабуе выкараскацца з палонкі на край лёду. Шырыня ракі ў гэтым месцы дасягае 25 метраў, — расказалі ў Цэнтры даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці МНС. — Праз 15 хвілін сабаку з выкарыстаннем выратавальнага плыта, гідраўлічных касцюмаў дасталі з вады на бераг. Пасля яго перадалі жыхару прыватнага сектара, які паабяцаў абагрэць «сябра чалавека» і знайсці яму гаспадара.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні свайму калегу Пазнякову Віктару Анатольевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Утерянный представительством Белгосстраха** по Центральному району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев формы 2РН серии БЛ № 1204676 **считать недействительным**.
УНП 101883943

**На скрыжаванні думак**

# «Цэннікі» ў ВНУ будуць расці

## ...бо колькасць ахвотных набыць дыплом «любой цаной» не змяншаецца...

**ПАВЕДАМЛЕННЕ пра чарговае павышэнне кошту навучання ў ВНУ, напэўна, мала каго пакінула абыякавым, бо амаль што ў кожнага з нас ёсць сваяк, сусед ці знаёмы, які атрымлівае адукацыю на платнай аснове. Як сведчыць статыстыка, за кошт сродкаў бюджэту навучаецца толькі кожны трэці студэнт, а 64% усіх студэнтаў вымушаны аплачваць сваё навучанне. Трэба сказаць, што цэны за навучанне ў некаторых дзяржаўных ВНУ і да апошняга павышэння літаральна «зашкальвалі». А сёння на асобных спецыяльнасцях і ўвогуле перасягнулі 12-мільённую адзнаку. І гэта пры тым, што ўрад выступіў катэгарычна супраць тых лічбаў, якія прапаноўвала кіраўніцтва ВНУ. Для новых цэн было ўстаноўлена строгае абмежаванне — не больш чым 29 працэнтаў.**

— Для мяне не зусім зразумела, чаму ў прыватнай ВНУ рыхтуюць спецыяліста за 7,5 млн рублёў у год, а ў дзяржаўнай ВНУ на аналагічнай спецыяльнасці кошт падрыхтоўкі спецыяліста дасягае 17 мільёнаў рублёў. Прычым гутарка ідзе пра моцную прыватную ВНУ з добрай матэрыяльна-тэхнічнай базай, дзе ўмудраюцца яшчэ і адкладваць з прыбытку сродкі на будаўніцтва студэнцкага інтэрната... Калі не можаце забяспечыць эканоміку, то лепш увогуле спыняйце платную падрыхтоўку, — заявіў на выніковай калегіі Міністэрства адукацыі, звяртаючыся да кіраўнікоў дзяржаўных ВНУ, **віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль ТОЗІК**. — Давайце з вамі дамовімся на наступны навучальны год: па тых спецыяльнасцях, дзе назіраецца перавытворчасць кадраў, але моладзь гэтая акалічнасць мала турбуе, правільна вайце сабекошт падрыхтоўкі, дабаўляйце працэнты прыбытку, якія самі палічыце слушнымі, і называйце суму. Мы ўсе жывём ва ўмовах рынку. І калі малады чалавек, нягледзячы ні на што, жадае навучацца менавіта на гэтай спецыяльнасці, то няхай будзе гатовы выкласці названую суму. А вось тыя спецыяльнасці, выпускнікі якіх у наймальнікаў літаральна нарасхват, трэба падтрымліваць і часткова кампенсаваць кошт платнай падрыхтоўкі спецыялістаў з дзяржаўнага бюджэту.

Да слова, наш чытач з вёскі Любань Лунінецкага раёна Сцяпан Нефідовіч папрасіў паставіць рубам перад Міністэрствам адукацыі наступнае пытанне: **чаму конкурсны адбор дзейнічае толькі на ўваходзе ў ВНУ?** Чаму маладыя людзі, якія выдатна вучацца, але якім не хапіла літаральна некалькі балаў для паступлення на бюджэтную форму навучання, вымушаны ўсе пяць гадоў плаціць вялізныя грошы, а іх аднакурснікі-бюджэтнікі ледзь здаюць экзаменацыйныя сесіі і незразумела як пераходзяць з курса на курс? Ці не таму, што змагацца за месца пад сонцам «бюджэтнікам» ужо не трэба... Магчыма, больш правільным было б і ў працэсе навучання адбіраць для падрыхтоўкі за бюджэтныя сродкі толькі самых здольных і паспяховых студэнтаў?

— Бачанне сацыяльнай справядлівасці асобнымі студэнтамі не пазбаўлена рацыянальнага зерня, — пагаджаецца міністр адукацыі Сяргей Маскевіч. — Але яго рэалізацыя цягне за сабой вялікія цяжкасці прававога характару. Да таго ж ёсць пагроза стварыць глебу для карупцыйных злоўжыванняў ужо непасрэдна падчас навучальнага працэсу. Дзякуючы ўкараненню цэнтралізаванага тэсціравання ўжо некалькі гадоў прыёмныя кампаніі не суправаджаюцца скандаламі, звязанымі з фактамі хабарніцтва. Затое мы можам стварыць «пралазы» для карупцыйных маніпуляцый ужо на экзаменацыйных сесіях...

Па словах Сяргея Маскевіча, студэнты-платнікі, якія добра навучаюцца, маюць магчымасць пры вызваленні бюджэтных месцаў прэтэндаваць на перавод на «бюджэт». Да таго ж дзейнічае гібкая сістэма прадастаўлення скідак з устаноўленага кошту навучання для студэнтаў, якія маюць высокія дасягненні ў вучэбнай, навукова-даследчай або грамадскай дзейнасці, а таксама сістэма скідак студэнтам-платнікам па сацыяльных паказаннях. Для прыкладу, за 2010/2011 навучальны год сума прадстаўленых скідак з кошту платнага навучання ў падпарадкаваных Міністэрству адукацыі навучальных установах склала 4,24 млрд рублёў: 3,89 млрд рублёў у ВНУ і 0,35 млрд рублёў — у сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Да таго ж маладыя людзі могуць скарыстацца і льготным крэдытам. У 2010 годзе льготныя крэдыты на навучанне на суму амаль 56 млрд рублёў атрымалі больш як 19 тысяч студэнтаў.

І ўсё ж такі платнае навучанне ў ВНУ апошнім часам выклікае даволі шмат спрэчных пытанняў. Людзі, гатовыя плаціць за сваё навучанне, — пажаданыя госці не толькі ў прыватных ВНУ, дзе яны з'яўляюцца фактычна адзінай крыніцай іх існавання, але і ў дзяржаўных ВНУ, якія таксама пастаўлены перад неабходнасцю зарабляць грошы. Дастаткова паглядзець на прахадныя балы на платнай форме навучання, якія могуць адрозніваца ад прахаднога бала «на бюджэце» на сотню адзінак. А колькі было за два апошнія гады выпадкаў, калі на платныя месцы залічваліся і ўвогуле ўсе ахвотныя... Калі не запаўняюцца месцы на платнай форме навучання, значыць, не выконваюцца даведзеныя лічбы па платных паслугах і выкладчыкаў трэба скарачаць; а адлічваць студэнтаў-платнікаў — значыць губляць грошы. Такім чынам, відавочная супрацьлеглаcць інтарэсаў: з аднаго боку, платная форма навучання дапамагае фінансава падтрымліваць ВНУ, а з іншага боку — за яе навучальныя ўстановы вымушаны расплачвацца нізкай якасцю падрыхтоўкі кадраў.

У гэтым плане даволі цікавымі падаюцца вынікі праведзенага ў лістападзе мінулага года спецыялістамі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы апытання. Галоўнай мэтай яго было вызначыць матывацыю абітурыентаў пры выбары прафесіі. Апытаннем былі ахоплены 4,5 тысячы выпускнікоў школ Гродзеншчыны. Больш як 80% выпускнікоў паведамілі, што асноўны фактар пры выбары спецыяльнасці для іх — гэта інтарэс да канкрэтнай спецыяльнасці. Аднак для большай паловы старшакласнікаў важнейшае значэнне мае прэстыжнасць спецыяльнасці. Першыя радкі ў гэтым рэйтынгу займаюць эканамічныя, медыцынскія, юрыдычныя і інжынерныя спецыяльнасці. Цікава, што толькі 7% выпускнікоў звязваюць свой выбар з даступным коштам навучання. Кожны восьмы рэспандэнт плануе навучацца на платнай аснове. І 42% выпускнікоў адзначылі, што ў сітуацыі выбару (не прэстыжна, затое навучанне на бюджэце ці прэстыжна, але навучанне на платнай аснове) яны аддадуць перавагу навучанню на прэстыжнай спецыяльнасці, няхай і за ўласныя сродкі. А гэта значыць, што цэны за навучанне будуць расці і далей, паколькі ахвотныя заўсёды знойдуцца. І наўрад ці нават апошнія «цэннікі» прымусяць будучых першакурснікаў задумацца. Хіба толькі ўсе пры заключэнні дагавора на платнае навучанне спадзяюцца, што менавіта ім выпадзе шанц перавесціся «на бюджэт». Але шанцуе толькі адзінкам...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Фота БЕЛТА.

**На пагранічнай заставе «Камянюкі» 23 лютага, у Дзень абаронцаў Айчыны, служба ў звычайным рэжыме.**

**Акцыя**

## У ПАЗНАВАЛЬНАЙ ФОРМЕ — ПРА НАШУ АГУЛЬНУЮ БЯСПЕКУ

**СЁННЯ ва ўсіх раённых і абласных цэнтрах адбудзецца рэспубліканская прафілактычная акцыя «Бяспека — у кожны дом». Яе мэта — прадухіленне пажараў і гібелі людзей на іх ва ўласных кватэрах і дамах. Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Беларуская моладзевая грамадская арганізацыя выратавальнікаў-пажарных.**

— Сёлетняя зіма, на жаль, нягледзячы на шматразовыя напаміны пра важнасць захавання правілаў пажарнай бяспекі, паспела пакінуць свой вогненны след у аператыўных зводках, — сказала старшы інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Дыяна Жалязняк. — Акцыя, якая, хутчэй, будзе нагадваць тэатралізаванае прадстаўленне з нумарамі мастацкай самадзейнасці, адначасова будзе праводзіцца ў буйных гандлёвых цэнтрах, дамах культуры, сельскіх клубах ці на адкрытых пляцоўках. Падчас мерапрыемства супрацоўнікі «Белдзяржстраха» праінфармуюць грамадзян пра розныя віды страхавання маёмасці. На жаль, часта людзі, у каго яна пацярпела на пажары, занадта позна задумваюцца пра тое, як можна было б гарантаваць пакрыццё атрыманай у такім выпадку шкоды. А прадстаўнікі добраахвотнага пажарнага таварыства арганізуюць прэзентацыю і продаж аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў і вогнетушыцеляў.

У сталіцы, як удакладнілі ўжо ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, у якасці такіх цэнтральных пляцовак для сустрэч выратавальнікаў, прадстаўнікоў страхавой арганізацыі, артыстаў і творчых калектываў устаноў культуры з насельніцтвам вызначаны Камароўскі рынак (у 14 гадзін) і гандлёвы цэнтр «Сталіца» (у 15 гадзін).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Погляд**

# Пётр НІКІЦЕНКА: «БЕЛАРУСІ ЛЁСАМ НАКАНАВАНА СТАЦЬ ЗБОРАЧНЫМ І КАНСТРУКТАРСКІМ ЦЭХАМ СВЕТУ»

**Прысутнасць Беларусі ў Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП) — відавочна, самая актуальная тэма для разваг вядучых эканамістаў краіны. Сёння на гэтую тэму карэспандэнт «Звязды» гутарыць з доктарам эканамічных навук, прафесарам, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пятром НІКІЦЕНКА.**



***— Пётр Георгіевіч, што вы думаеце з нагоды размоў, каментарыяў і публікацый аб тым, што АЭП — гэта вынаходніцтва Крамля з мэтай заманіць спачатку Беларусь і Казахстан, а затым і Украіну пад сваю былую імперскую ўладу?***

— Я ўпэўнены ў тым, што АЭП не пагражае стратай суверэнітэту ні нам, ні Казахстану, ні тым больш Расіі. Гэта ўсё чуткі, яны не вартыя ўвагі. А вось дапамагчы застацца нам як партнёрам пры сваіх эканамічных інтарэсах АЭП можа. Бо адна з відавочных рыс глабалізацыі эканомікі — узмацненне канкурэнцыі з боку вытворцаў азіяцкіх краін, якія сёння хутка і дынамічна развіваюцца. Прычым канкурэнцыі далёка не заўсёды добрасумленнай. Таму АЭП прадастаўляе дадатковыя магчымасці для сумеснага супрацьстаяння такой пагрозе.

***— Дзякуй, супакоілі. Тады адкажыце на такое пытанне: як і наколькі далучэнне да АЭП можа радыкальна змяніць экспартна-імпартную і вытворчую палітыку Беларусі?***

— АЭП — гэта новыя перспектывы для актывізацыі і пашырэння інавацыйнага супрацоўніцтва ў міжнародным маштабе. АЭП дазволіць аб'яднаць у рамках навукова-тэхнічных, інавацыйных і інвестыцыйных праектаў інтэлектуальныя рэсурсы і навукова-вытворчы патэнцыял трох дзяржаў. А рэалізацыя гэтых сумесных планаў дапаможа вырашыць і важныя сацыяльна-эканамічныя задачы, якія даўно наспелі ў Беларусі, Расіі і Казахстане. У прыватнасці, для нашых вытворцаў сёння надзвычай актуальнай з'яўляецца задача павышэння спажывецкіх якасцяў прадукцыі, каб яна адпавядала стандартам сусветнага ўзроўню і была канкурэнтаздольная па цане і якасці ў краіне і на замежных рынках. Без гэтага не будзе росту экспарту і імпартазамяшчэння, запаволяцца паступленні ў краіну валюты, што можа зноў абвастрыць сітуацыю на фінансавым рынку.

Беларусь раней называлі зборачнымі цэхам Савецкага Саюза. Цяпер перад ёй адкрываецца перспектыва ўвогуле стаць зборачным і канструктарскім цэхам свету. Я лічу, што гэта рэальна. Сёння дзякуючы АЭП мы маем усе шанцыператварыцца ў краіну актыўнага выкарыстання інтэлектуальных, навукаёмістых і экалагічна бяспечных тэхналогій. Бо ёсць два асноўныя крытэрыі эканомікі. Першы — захаванне прыроды, яе рэсурсаў для будучых пакаленняў. Другі — сам чалавек, развіццё яго розуму, паляпшэнне жыцця, забеспячэнне здароўя і «працаздольнага» даўгалецця.

***— Давайце канкрэтызуем ваш адказ. У чым перавагі Адзінай эканамічнай прасторы для нас, скажам, з пункту погляду нармальнага прагматызму?***

— Мы сёння маем магчымасць, напрыклад, атрымаць шырокі доступ да выкапняў Казахстана і Расіі. І тым самым забяспечыць нашу прамысловасць у дастатковых аб'ёмах сыравінай. Я думаю, што цяпер нам не варта развіваць энергетыку шляхам распрацоўкі ўласных радовішчаў вугалю ці сланцаў. Бо выкарыстанне айчынных прыродных рэсурсаў у энергетычных мэтах пакуль не абяцае быць эфектыўнай справай. На гэты конт існуе шмат аўтарытэтных экспертных заключэнняў. Няма сэнсу іх пераказваць. Адзначу, што нам эканамічна больш выгадна выкарыстоўваць замежныя крыніцы энерганосьбітаў: купляць іх, набываць ліцэнзіі на канцэсію ў суседніх краінах. А самім развіваць выпуск высокатэхналагічнай і навукаёмістай прадукцыі, запатрабаванай у АЭП і на знешніх рынках.

***— Патлумачце, калі ласка, сваю думку.***

— Напрыклад, у Расіі, Казахстане ці нават ва Украіне мы бяром канцэсію на здабычу вугалю (ён там па якасных характарыстыках значна лепшы за беларускі), хутчэй за ўсё, адну ці некалькі шахтаў, кажу ўмоўна. Пад іх мадэрнізацыю прыцягваем айчынныя і замежныя інвестыцыі. Такім чынам мы ствараем сумесны інвестыцыйны кластар, які будзе працаваць на энергетыку Беларусі. Нагадаю, кластар — гэтае аб'яднанне пад адным «дахам» эканамічна вельмі цесна звязаных фірмаў сумежнага профілю, якія зацікаўлены ва ўзаемным садзейнічанні агульнаму развіццю і росту канкурэнтаздольнасці. Такі падыход забяспечвае канкурэнтныя перавагі ўдзельнікам кластару ў параўнанні з іншымі прадпрыемствамі. У гэтым плане АЭП адкрывае перад намі новыя далягляды па выкарыстанні замежных інавацый для якаснай перапрацоўкі рэсурсаў Расіі і Казахстана. Вось у некалькіх словах сэнс сучаснай прамысловай палітыкі Беларусі ў вельмі адчувальнай для нас галіне энергетыкі.

**Дзякуючы членству ў АЭП Беларусь становіцца больш прывабнай для замежных інвестараў.**

Як вядома, «вузкае» месца нашай краіны — слабы рэсурсны патэнцыял. Мала ў нас, на жаль, каштоўных прыродных выкапняў, у прыватнасці, вуглевадародаў. А тыя, што ёсць, не даюць дастаткова сыравіны айчыннай індустрыі. Таму знявечваць нашу цудоўную і прыгожую зямлю кар'ерамі — не выгадна па многіх прычынах. Лепш развіваць экалагічны турызм, пракладваць «зялёныя» маршруты, чым ствараць велізарныя горы з пустой пароды вакол шахтаў.

***— Што яшчэ карыснага, акрамя карысных выкапняў, можа даць АЭП усім яе ўдзельнікам?***

— Дзякуючы членству ў АЭП тэрыторыя Беларусі становіцца больш прывабнай для замежных інвестараў: у іх з'явілася, кажучы ваеннай мовай, магчымасць набыць плацдарм для далейшага наступлення на рынкі Казахстана і Расіі. Гэта павышае нашы шанцы для прыцягнення інвестыцый у высокатэхналагічныя прадпрыемствы. З пачатку года расце інтарэс дзелавых людзей замежжа да нашай краіны, умоў эканамічнага супрацоўніцтва з намі ў рамках АЭП. Вось свежы прыклад. Навукоўцы-эканамісты ўніверсітэта імя Каперніка з польскага горада Торунь папрасілі мяне падрыхтаваць шэраг матэрыялаў для манаграфічнага выдання «Беларусь у сусветнай супольнасці». З палякамі ў нас шмат агульнага: мы ж некалі жылі ў адной дзяржаве. І сёння Польшча займае 6 месца (ці 2,8%) у аб'ёме нашага тавараабароту з 202 краінамі свету. Дык чаму не весці ўзаемавыгадны бізнэс? Але польскія ўлады не гатовы да гэтага.

Увогуле прыкладаў росту інтарэсу да нашай краіны шмат. У прыватнасці, мы, супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук, зараз рэалізоўваем сумесны праект з украінскімі калегамі па развіцці інавацыйнага супрацоўніцтва Беларусі і Украіны. Наша задача — у недалёкай перспектыве давесці знешнегандлёвы тавараабарот да 10-15 мільярдаў долараў ЗША. Упэўнены, эканамічная інтэграцыя з Украінай, дзе магутныя навука і прамысловасць, абяцае быць вельмі плённай. Як, між іншым, і развіццё знешнеэканамічных стасункаў з краінамі Балтыі. Іх марскія парты гатовыя весці справы на выгадных для нас умовах. Праз краіны Балтыі нам лягчэй выходзіць на рынкі Еўрапейскага саюза. Беларусі абавязкова трэба захоўваць і ўмацоўваць сваю прысутнасць у краінах, з якімі ў нас традыцыйна склаліся даўнія сяброўскія адносіны.

Членства ў АЭП таксама дазволіць актыўней ствараць сумесныя прадпрыемствы ў Беларусі, адкрываць зборачныя вытворчасці за мяжой. Я лічу, што нам трэба больш актыўна асвойваць афрыканскі кантынент. У Беларусі шмат прадпрыемстваў, якія здольныя забяспечыць там пераход нацыянальных эканомік на новыя энергаёмістыя тэхналагічныя платформы і вытворчасць новых відаў прадукцыі. Галоўнае, што ў афрыканцаў захаваліся добрыя адносіны да Беларусі і Расіі. Многія цяперашнія кіраўнікі і лідары краін Афрыкі некалі вучыліся ў нашых ВНУ.

***— Безумоўна, метал, вуглевадароды, нанатэхналогіі — вельмі важныя рэчы для поспеху. А ці заўсёды мы бяром у разлік чалавечы фактар пры складанні нашых велічных планаў на глыбокую перспектыву? Ці заўсёды ўлічваем бюракратычныя бар'еры на шляху дзелавой ініцыятывы? Пра яе разняволенне слоў шмат, а істотных зрухаў няма. Чаму?***

— Я ўжо гэтую думку выказваў, дазволю сабе яшчэ раз паўтарыць яе. Наспела неабходнасць кардынальных змен у светапоглядзе і філасофіі паводзін нашых начальнікаў рознага ўзроўню, чыноўнікаў, кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў і акцыянерных таварыстваў — адным словам, гаспадарнікаў. Праблема, на мой погляд, у тым, што мы проста баімся быць першымі ва ўкараненні тых або іншых інавацый, перад прыняццем адказнага рашэння любім перастрахавацца, лішні раз параіцца з начальствам па вертыкалі. Гэта не лепшая рыса нацыянальнага характару. Такая беларуская спецыфіка сур'ёзна стрымлівае дзелавую ініцыятыву знізу, не спрыяе ўкараненне інавацый ужо на псіхалагічным узроўні.

А дадайце да гэтага традыцыйна моцную ў Беларусі ролю дзяржавы. Без блаславення і падтрымкі з самага верху ў нас ніхто не тое што не асмеліцца на ўкараненне новага — хутчэй за ўсё, ніхто нават не рызыкне загаварыць, каб агучыць нейкія новыя паняцці. Так ужо склалася: для руху наперад нам неабходна па ўсёй вертыкалі ўлады санкцыя, каманда.

**Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

*Уважаемые акционеры ОАО «Заводской райпищеторг»!*

**29 марта 2012 года в 11.00**
**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»

**Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Варвашени, 50.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основных направлениях деятельности Общества на 2012 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2011 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2011 год.
5. О распределении чистой прибыли за 2011 год. О выплате дивидендов за 2011 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2012 году и 1 квартале 2013 года.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
9. О локальных нормативных актах Общества.

Регистрация участников собрания с 9.30 до 10.45 29 марта 2012 года по месту проведения собрания акционеров. Для регистрации при себе иметь документ, удостоверяющий личность (представитель акционера — и доверенность).

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни — с 8.45 до 17.00 по месту нахождения Общества, начиная с 22 по 29 марта 2012 года.

**Справки по телефону 243 52 98.**

УНП 100103703 *Наблюдательный совет.*

---

## ОАО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 30 марта 2012 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков ОАО «ДСТ № 3» за 2011год.
2. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «ДСТ № 3» за 2011 год.
3. О распределении чистой прибыли и начислении дивидендов за 2011 год.
4. Утверждение основных направлений деятельности ОАО «ДСТ № 3» на 2012 год.
5. О распределении чистой прибыли на 2012 год.
6. Выборы членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Об утверждении размера вознаграждений и компенсаций расходов членам Наблюдательного совета, ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться **30.03.2012 г. с 10.00 до 10.45** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – **27.02.2012 г.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с «Инструкцией о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями», утвержденной постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30.08.2006 г. № 1093).

Справки по телефонам: **23 64 24, 23 64 87** –
Отдел экономического анализа и прогнозирования,
Наблюдательный совет. УНП 700049607

---

**Уважаемые акционеры ОАО «Технoприбор»!**

**29 марта 2012 года**
**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «ТЕХНОПРИБОР»,

**расположенного по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 96.**

**Собрание пройдет по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 96, здание столовой ОАО «Технoприбор».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год. Утверждение показателей социально-экономического развития Общества на 2012 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2011 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2011 год, распределение прибыли и убытков Общества.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2011 год.
5. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2011 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2012 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Об утверждении органа печати Общества.

